# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(476)

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., праф. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of the History of the Slavic Peoples*
*of the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ (1921–1936 гг.): ПАМІЖ АСВЕТНІЦТВАМ І ПАЛІТЫЗАЦЫЯЙ

*У артыкуле абагулены вопыт дзейнасці Таварыства беларускай школы (ТБШ) на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1936 гг. Аўтар канкрэтызаваў пачатковую дату ў гісторыі гэтага таварыства (зацвярджэнне яго статута 1 ліпеня 1921 г.), вылучыў тры перыяды: пачатак 1920-х гг.; 1926–1930 гг. (стала масавай культурна-асветніцкай арганізацыяй: у сярэдзіне 1930 г. у больш чым 500 гуртках было аб'яднана звыш 15 тыс. чалавек); 1931–1936 гг. Раскрыта роля ТБШ у самазахаванні беларусаў ад паланізацыі, павышэнні іх агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню. Выказаны прапановы аб неабходнасці абагульняльнага манаграфічнага выдання, сістэматызацыі крыніц, а таксама мемарыялізацыі гісторыі ТБШ, яе кіраўнікоў і актывістаў.*

***Ключавыя словы:*** *Таварыства беларускай школы, асветніцтва, паланізацыя, асіміляцыя, палітызацыя.*

## *Association of the Belarusian School (1921–1936): between Enlightenment and Politicization*

*The article summarizes the experience of the Association of the Belarusian School Society (TBSh) on the territory of Western Belarus in 1921–1936. The author specified the initial date in the history of this society (approval of its charter on July 1, 1921), distinguished 3 periods: the beginning of the 1920s; 1926–1930 (became a mass cultural and educational organization: in the mid-1930s, more than 15 000 people were united in more than 500 circles); 1931–1936. The role of TBSh in the self-preservation of Belarusians from polonization, raising their general educational and cultural level is revealed. Proposals were made about the need for a generalizing monographic edition, systematization of sources, as well as memorialization of the history of the TBSh, its leaders and activists.*

***Key words:*** *Association of the Belarusian school, education, polonization, assimilation, politicization.*

### Уводзіны

У 2021 г. споўнілася 100 гадоў Таварыству беларускай шлолы (ТБШ), адной з самых масавых легальных культурна-асветніцкіх арганізацый Заходняй Беларусі. У айчыннай гістарычнай навуцы даследаванне дзейнасці Таварыства пачаў адзін з яго кіраўнікоў – П. Мятла [1]. У пасляваенныя дзесяцігоддзі вывучэнне дзейнасці гэтай грамадскай арганізацыі разглядалася пераважна ў кантэксце гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і ўсяго левaрадыкальнага напрамку заходнебеларускага нацыянальнага руху, а таксама пры адлюстраванні неспрыяльнага становішча краю ў складзе Польшчы (у працах І. Палуяна, У. Палуяна, А. Мацко, П. Зялінскага, У. Ладысева, С. Говіна, М. Ракевіча, А. Віхрава, М. Бабра і інш. [2–6]). Вывучаўся склад і арганізацыйнае развіццё ТБШ, яго ідэалагічная накіраванасць, школьныя кампаніі, культурна-асветніцкая дзейнасць. Біяграфіі асобных кіраўнікоў і актывістаў ТБШ закраналі літаратуразнаўцы У. Калеснік, А. Ліс. Г. Сянькевіч паказала арганізацыю школьнай справы, змест навучання і выхавання ў беларускіх пачатковых школах і гімназіях, педагагічную дзейнасць і погляды Б. Тарашкевіча, С. Паўловіча і іншых дзеячаў [7]. Свой уклад у даследаванне тэмы ўнеслі і польскія вучоныя, асабліва А. Бергман [8–10].

У гістарычнай навуцы Рэспублікі Беларусь далейшая распрацоўка гісторыі ТБШ ажыццяўлялася на падставе масіваў новых крыніц (асабліва архіўных дакументаў) з выкарыстаннем разнастайных сучасных навуковых метадаў. Найперш гэта было вы-

кладзена ў калектыўных навуковых працах па айчыннай гісторыі, гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі [11–12]. Пачалося пераасэнсаванне дзейнасці КПЗБ [13]. Шматгранная дзейнасць ТБШ была выкладзена і аўтарам дадзенага артыкула ў навуковых і навукова-папулярных часопісах [14–16], энцыклапедычных выданнях [17–19], зборніках матэрыялаў канферэнцый [20], а таксама ў аўтарскіх манаграфіях, калектыўным навуковым выданні [21–23]. Пытанні польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыкі ў Заходняй Беларусі, беларускага нацыянальнага руху вывучаюць А. Загідулін, А. Горны і інш. [24–25].

Нягледзячы на адносную навуковую распрацаванасць тэмы, шэраг даследчыцкіх праблем патрабуе паглыбленага вывучэння, дапаўнення і тлумачэння, звароту да больш шырокага кола крыніц. У прыватнасці, пакуль няма дакладнага ўяўлення пра храналагічны пачатак гісторыі ТБШ (фігуруюць даты 26 лютага, 1 ліпеня ці 7 снежня 1921 г. [26]). Патрабуецца далейшае ўвядзенне ў навуковы ўжытак матэрыялаў вуснай гісторыі (успамінаў і інш.), якія дазволяць шырэй раскрыць паўсядзённае жыццё на нізавым структурным узроўні Таварыства. Запатрабаваным з'яўляецца і вызначэнні ролі гэтай арганізацыі ў самазахаванні беларусаў ад паланізацыі.

Менавіта таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца абагульненне вопыту культурна-асветніцкай дзейнасці ТБШ на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1936 гг. Дзеля гэтага будуць канкрэтызаваны, удакладнены звесткі пра арганізацыйнае станаўленне Таварыства, выкарыстаны ўспаміны аднаго з яго кіраўнікоў – Ф. Стацкевіча.

**ТБШ у першай палове 1920-х гг.**

Асветніцтва – гэта вядучы напрамак у культурна-асветніцкай дзейнасці, які ўключаў у сябе найперш ліквідацыю непісьменнасці і ажыццяўленне самаадукацыі сярод дарослага насельніцтва, а таксама навучанне і выхаванне дзяцей у нацыянальных пачатковых і сярэдніх школах, пазашкольную асвету. Хоць у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. пытаннямі нацыянальна-культурнага жыцця займаліся палітычныя партыі і арганізацыі, беларускія парламентарыі ў польскім сейме, аднак найбольш паслядоўна і сістэматычна асветніцтва ажыццяўлялася менавіта на грамадска-арганізацыйным узроўні – у складзе легальных культурна-асветніцкіх арганізацый, што мелі структурныя падраздзяленні і мясцовы актыў. Такой арганізацыяй і стала ТБШ.

Гэтая культурна-асветніцкая арганізацыя ўзнікла ў межах Сярэдняй Літвы (1920–1922 гг.). На пасяджэнні Цэнтральнай беларускай школьнай рады (ЦБШР) у Вільні 22 лютага 1921 г. была прынята пастанова аб стварэнні спецыяльнага ТБШ, «якому школьная рада перадасць свае паўнамоцтвы і маёмасць» [27, арк. 18]. На пашыраным сходзе рады з удзелам прадстаўнікоў ад Беларускага цэнтральнага вучыцельскага саюза і іншых нацыянальных арганізацый 26 лютага 1921 г. быў ухвалены праект статута ТБШ [27, арк. 22]. Канчаткова статут дапрацоўваўся Б. Тарашкевічам, які быў старшынёй ЦБШР. Яшчэ з 15 лістапада 1920 г. ён кіраваў беларускай секцыяй дэпартамента асветы Часовай кіруючай камісіі Сярэдняй Літвы [28, арк. 2]. На Віленшчыне беларускія школы пачалі адкрывацца яшчэ з восені 1915 г. У сакавіку 1921 г. у Ашмянскім павеце існавала каля 130, у Свянцянскім – каля 30, у Віленскім – 2, у Вільні – 7 беларускіх пачатковых школ, што ахоплівалі да 10 тыс. дзяцей. Таксама дзейнічалі Віленская беларуская гімназія і беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах [29, с. 3]. Паводле некаторых звестак, у канцы 1920 г. у Сярэдняй Літве было 186 беларускіх школ [30, с. 50] ці ў студзені 1921 г. – 180 [31, с. 2]. У студзені 1922 г. у Сярэдняй Літве дзейнічала 178 беларускіх пачатковых школ, беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах (узначальваў С. Рак-Міхайлоўскі), курсы для настаўнікаў, беларускія гімназіі ў Вільні і Радашковічах [27, арк. 54].

Аднак ужо ў канцы 1920/21 навучальнага года пачаўся наступ на беларускую асвету. У Валожынскім і Вілейскім паветах, якія былі адлучаны ад Сярэдняй Літвы і ўключаны ў Навагрудскае ваяводства ў складзе Польшчы, было закрыта больш за 120 беларускіх пачатковых школ [31, с. 2]. Справа дайшла і да ліквідацыі беларускай секцыі дэпартамента асветы і звальнення яе кіраўніка Б. Тарашкевіча.

1 ліпеня 1921 г. статут ТБШ быў зацверджаны дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы. Менавіта гэтае юрыдыч-

нае рашэнне дало легальныя магчымасці для арганізацыйнай працы. Такім чынам, перыяд з 26 лютага да 1 ліпеня 1921 г. можна лічыць падрыхтоўчым ў гісторыі ТБШ. Асноўная мэта Таварыства ў статуце была сфармулявана так: *«пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу»* [32, с. 7]. ТБШ мела права адкрываць і ўтрымліваць розныя ўстановы адукацыі і культуры, праводзіць лекцыі і курсы, займацца выдавецкай дзейнасцю і г. д. [33, с. 3–4; 34, с. 2–3]. Дазвалялася засноўваць гурткі і аддзелы ТБШ.

8 жніўня 1921 г. ад імя заснавальнікаў арганізацыі да грамадскасці звярнуліся А. Луцкевіч, М. Кахановіч. 23 жніўня 1921 г. адбыўся першы арганізацыйны сход, дзе пастанавілі, каб ЦБШР перадала ўсе справы ТБШ, выбрана частка яго Управы [35, с. 4]. Чарговы арганізацыйны сход Таварыства прайшоў 4 верасня 1921 г., а 7 верасня 1921 г. – сход Управы. 12 верасня 1921 г. на пасяджэнні ЦБШР была прынята дакладная запіска (“мемарыял”) польскім уладам аб цяжкім становішчы беларускіх школ [36, с. 4].

Сярод заснавальнікаў ТБШ былі Б. Тарашкевіч, Я. Гаўрылік, А. Луцкевіч, А. Станкевіч, Ф. Стацкевіч, І. Канчэўскі, А. Трэпка, М. Кахановіч, А. Смоліч, В. Багдановіч, С. Рак-Міхайлоўскі, В. Іваноўскі, Л. Родзевіч і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Да канца кастрычніка 1921 г. агульны спіс удзельнікаў дасягнуў 121 [37, с. 6]. Рада ТБШ накіравала міністру веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы дакладную запіску («мемарыял»), у якой дамагалася ўтварыць сетку беларускіх школ прапарцыянальна колькасці насельніцтва і прыняць на дзяржаўнае ўтрыманне ўжо існуючыя беларускія школы, перастаць прымусова вывозіць беларускіх настаўнікаў на курсы ў цэнтральныя рэгіёны Польшчы, адкрыць беларускую настаўніцкую семінарыю і кароткачасовыя дадатковыя настаўніцкія курсы, адпусціць большыя крэдыты для выдання беларускіх школьных падручнікаў, адкрыць кафедру беларусістыкі ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя, утварыць у міністэрстве асобны аддзел беларускіх школ і інш. [37, с. 6; 38, с. 3].

Кіруючым органам ТБШ стала Беларуская школьная рада. 21 кастрычніка 1921 г. адбылося пасяджэнне прэзідыуму Рады ТБШ. 25 кастрычніка 1921 г. прайшоў агульны сход Рады ТБШ, быў перавыбраны прэзідыум. Старшынёй застаўся А. Смоліч, а сакратаром выбраны І. Краскоўскі [37, с. 6].

Такім чынам, у структуры таварыства выканаўчым органам была Беларуская цэнтральная школьная рада (БЦШР) – 12 чалавек, у склад прэзідыуму ўключаны 7 чалавек. У 1923 г. у прэзідыум БЦШР увайшлі А. Станкевіч (старшыня), С. Рак-Міхайлоўскі і М. Пяткевіч (намеснікі старшыні), А. Канчэўскі і П. Мятла (сакратары), Г. Багдановіч (скарбнік), М. Кахановіч (намеснік скарбніка).

7 снежня 1921 г. у Радашковічах Б. Тарашкевічам было таксама заснавана ТБШ. ТБШ было заснавана і ў Навагрудку (у пачатку 1922 г. яшчэ не было зацверджана польскімі ўладамі) [39, с. 6]. Пасля далучэння Сярэдняй Літвы да Польшчы ў 1922 г. гэтыя арганізацыі фактычна сталі рэгіянальнымі структурнымі часткамі ТБШ.

У цэлым у першай палове 1920-х гг. ТБШ абмежавалася пераважна ўтрыманнем беларускіх гімназій, пачатковых школ, пазбягала радыкалізму і праяўляла палітычную лаяльнасць [40, арк. 35]. Таварыства характарызавалася адсутнасцю структурнага адзінства, тэрытарыяльнай абмежаванасцю (найперш Вільня, асобныя мясцовасці Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў), вузкай сацыяльнай базай (пераважна інтэлігенцыя). Аднак з восені 1924 г. ТБШ пачало каардынаваць на месцах кампанію па складванні і падачы дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ [41, арк. 5].

**Пераўтварэнне ТБШ у масавую арганізацыю (1926–1930 гг.)**

Новы статут ТБШ быў зацверджаны міністрам унутраных спраў Польшчы 27 красавіка 1926 г. Мэтай арганізацыі з’яўлялася развіццё і пашырэнне асветы сярод беларусаў. Структура ТБШ стала наступнай: Галоўная ўправа – акруговыя ўправы – гурткі. Цяпер легальная дзейнасць таварыства пашырылася на ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі [42, с. 3]. 8 верасня 1926 г. быў зацверджаны склад Галоўнай управы (12 чалавек на чале з Р. Астроўскім), Нагляднай рады (5 чалавек са старшынёй С. Рак-Міхайлоўскім) [43, арк. 73]. Сярод персанальнага складу Галоўнай управы і Нагляднай рады ТБШ пераважалі дзеячы Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), якая выступа-

ла за адзіную працоўную школу з выкладаннем на роднай мове вучняў, з бясплатным навучаннем за кошт дзяржавы, і яе прыхільнікі з ліку інтэлігенцыі нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі. У 1927 г. Галоўная ўправа складалася з 4 аддзелаў: выдавецкага, пазашкольнай асветы, пачатковай школы і педагагічных курсаў, тэхнічна-гаспадарчага.

Пад уплывам Грамады была створана разгалінаваная сетка арганізацыйных адзінак ТБШ. Паводле няпоўных звестак, ужо ў канцы 1926 г. налічвалася больш 250 гурткоў Таварыства, яго 3 акруговыя ўправы (у Вілейцы, Гродне, Навагрудку), дзе было аб'яднана 3,5 тыс. чалавек, пераважна грамадаўцаў [22, с. 40]. Пераўтварэнне ТБШ у *«другую лінію акопаў»* дзеячы БСРГ пачалі рэалізоўваць загадзя [3, с. 108; 44, арк. 114; 45, арк. 20, 28]. Да сярэдзіны 1928 г. колькасць гурткоў ТБШ дасягнула 430 (14–15 тыс. чалавек), а ў сярэдзіне 1930 г. перавысіла 500 (больш 15 тыс. чалавек) – пераважна сялян, вясковай моладзі [46, арк. 8], якія былі ахоплены 12 акруговымі ўправамі: у Баранавічах, Беластоку, Вілейцы, Вільні, Гродне, Глыбокім, Косаве, Лідзе, Міры, Навагрудку, Свіслачы, Слоніме.

Такім чынам, пры самым непасрэдным удзеле актыву БСРГ і камуністаў ТБШ пераўтварылася ў масавую легальную культурна-асветніцкую арганізацыю. Якраз на гэты нізавы ўзровень заходнебеларускага руху, які арганічна дасягнуў сваёй масавасці без умяшальніцтва зверху, працягваючы традыцыі беларускай грамадскай актыўнасці пачатку ХХ ст. [25, с. 21], і не звярталася належная ўвага ў папярэдніх даследаваннях па гісторыі ТБШ. Хоць вывучаліся біяграфіі кіраўнікоў і актывістаў, аднак незаслужана недаацэнена дзейнасць шматлікіх шараговых гурткоўцаў у заходнебеларускіх паветах.

Акрамя прыярытэтнага асветніцтва (пашыранымі яго формамі былі курсы для ліквідацыі непісьменнасці, гурткі самаадукацыі, лекцыі, чытанні ўголас для непісьменных і малапісьменных і г. д.), культурна-асветніцкая праца ТБШ уключала таксама арганізацыйна-масавую работу (аказанне падтрымкі для кампаніі па збору подпісаў за адкрыццё беларускіх школ, яе каардынацыя), выдавецкую дзейнасць і бібліятэчную справу (наладжванне друку і распаўсюджвання вучэбнай літаратуры, перыёдыкі; стварэнне і ўтрыманне бібліятэк-чытальняў), культурна-мастацкую дзейнасць (арганізацыя самадзейных мастацкіх калектываў).

Важную ролю ў правядзенні асветніцкай работы таварыства выконвалі святліцы (клубы), бібліятэкі-чытальні (хаты-чытальні), народныя дамы. Найвышэйшага ўздыму ў сваім развіцці бібліятэкі-чытальні ТБШ дасягнулі ў 1928 г. – іх налічвалася звыш 250 (з-за рэпрэсіўных дзеянняў польскіх улад праз год засталося толькі 130). Сярод буйных вылучалася бібліятэка-чытальня імя Я. Купалы ў в. Вялікая Кракотка Слонімскага павета. Акрамя бібліятэк-чытальняў, асветніцкія функцыі выконвалі народныя дамы: у 1928 г. іх было 100, у 1929 г. – толькі 40 [5, с. 75, 76]. Аднак да сярэдзіны 1930-х гг. яны спынілі сваю дзейнасць.

Для ажыццяўлення статутных задач ТБШ абапіралася ў першую чаргу на ўнутраныя рэзервы. Сярод крыніц яго фінансавання былі членскія ўзносы (1,5 % ад зарплаты, часта ўсяго 0,2–0,5 злотага ў месяц), прыватныя ахвяраванні, прыбыткі ад выдавецкай працы, розных асветніцкіх, культурна-мастацкіх і іншых мерапрыемстваў. Была таксама і арганізацыйная, ідэалагічна-прапагандысцкая, вучэбна-метадычная, фінансавая дапамога з боку БССР [20, с. 88].

У дзейнасці ТБШ у канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. выразным стала ўзмацненне палітызацыі, што было выклікана як пашырэннем леварадыкальных палітычных поглядаў сярод гурткоўцаў, так і наўмысным фарсіраваннем палітычных працэсаў з боку заходнебеларускага камуністычнага руху [13, с. 85–86]. У такіх абставінах адбылося абвастрэнне супярэчнасцей паміж дзвюма плынямі ў ТБШ: прыхільнікамі палітызацыі (камуністы, прадстаўнікі клуба «Змаганне», леварадыкальныя кіраўнікі і актывісты Таварыства) і яе праціўнікамі (прадстаўнікамі нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі), што выступалі толькі за культурна-асветніцкую працу, пэўнае паразуменне (згодніцтва) з польскімі ўладамі. У канцы 1928 г. – першай палове 1929 г. прыхільнікі палітызацыі атрымалі большасць у акруговых і павятовых управах. Большая заангажаванасць гурткоў ТБШ у палітычную дзейнасць зніжала выніковасць асветніцтва [10, с. 177]. На нелегальным з'ездзе ў Вільні 19 мая 1929 г. прыхільнікі палітыза-

цыі дабіліся выключэння з ТБШ сваіх апанентаў (Р. Астроўскага, А. Луцкевіча і інш.), выбрання прадстаўнікоў levарадыкальных поглядаў у новы склад Галоўнай управы (яе ўзначаліў Ф. Стацкевіч) і Нагляднай рады. Праціўнікі палітызацыі не пагадзіліся з гэтым, але вымушаны былі прызнаць новае кіраўніцтва Таварыства. Аднак ідэалагічнае размежаванне паміж памяркоўным і радыкальным крылом прадоўжылася.

**ТБШ у 1931–1936 гг.**

У пачатку 1930-х гг. з-за паліцэйска-адміністрацыйнага ціску польскіх улад адбываўся заняпад ТБШ: ліквідаваліся яго гурткі, бібліятэкі, народныя дамы. Да канца 1933 г. уцалела толькі адна акруговая ўправа таварыства – у Беластоку, якая налічвала 50 гурткоў (600 чалавек) у Беластоцкім, Ваўкавыскім і Гродзенскім паветах, аднак і яна была забаронена ў сакавіку 1934 г. Нягледзячы на апраўдальны прыгавор, судовы працэс над членамі Галоўнай управы ТБШ Ф. Стацкевічам, Р. Шырмай, М. Пяткевічам у пачатку лютага 1933 г. у Вільні па абвінавачванні іх у «падрыўной дзейнасці камуністычнага характару» [47] (хоць М. Церах, Ю. Саковіч атрымалі па 3, Я. Скурко – 2 гады турэмнага зняволення) аказаў негатыўны ўплыў на стан арганізацыі.

Паводле ўспамінаў Ф. Стацкевіча, у апошнія гады існавання ТБШ усё цяжэй было склікаць яго агульныя сходы. *«Памяшканне, вызначанае для з’езду, блакіравалася дэфензівай, удзельнікаў з’езду затрымлівалі і ў найлепшым выпадку высылалі дамоў. Такім чынам, склікаць з’езд – гэта было аддаваць у рукі дэфензівы актыў Таварыства. Апошні з’езд, калі яго можна назваць з’ездам, адбыўся не ў вызначаным месцы, а на маёй кватэры на Ласёўцы. Ён складаўся амаль выключна з гарадскога актыву ў ліку не больш дзесятка чалавек. Як я даведаўся пазней ад суседзяў, падчас нашага паседжання дом кругом быў абстаўлены шпікамі»* [48, арк. 83].

Акрамя лакальнага правядзення школьнай кампаніі, уцалелыя гурткі нацэльваліся на стварэнне груп самаадукацыі. Асветніцкая праца актыўна прапагандавалася ў друку Галоўнай управы: «Бюлетэні ТБШ», газеце «Шлях», часопісе «Летапіс ТБШ».

Негатыўнае ўздзеянне на стан ТБШ аказалі сталінскія рэпрэсіі ў БССР супраць былых лідараў заходнебеларускага руху і Таварыства М. Бурсевіча, П. Валошына, Ф. Валынца, Я. Гаўрыліка, І. Дварчаніна, П. Мятлы, С. Рак-Міхайлоўскага і інш. Пазней ахвярай сталінізму стаў лідар Грамады Б. Тарашкевіч [20, с. 93–96].

У 1934–1935 гг. дзейнасць ТБШ прыйшла ў заняпад. Акрамя адмоўнага ўздзеяння польскіх паліцэйска-адміністрацыйных органаў варта адзначыць цэлы шэраг іншых прычын: адсутнасць матэрыяльных сродкаў для ажыццяўлення статутных задач; ідэалагічная барацьба паміж памяркоўным і радыкальным крылом Таварыства; падзенне масавай грамадскай актыўнасці заходнебеларускага насельніцтва, выкліканае нерэалізаванасцю яго сацыяльных і нацыянальных патрабаванняў (асабліва ў ходзе грамадаўскага ўздыму), апаскай за бяспеку ва ўмовах рэальных і магчымых ганенняў польскіх улад, складаным сацыяльна-эканамічным становішчам, якое прадвызначыла абмежаванасць выключна прыватнымі гаспадарчымі праблемамі. Пры заняпадзе легальнай культурна-асветніцкай працы частка былых актывістаў уключылася ў нелегальную дзейнасць камуністаў.

У сярэдзіне 1930-х гг. у межах стварэння шырокага антыфашысцкага народнага фронту заходнебеларускім камуністам і беларускім хрысціянскім дэмакратам удалося дамовіцца аб супрацоўніцтве ў галіне асветы: адпаведнае пагадненне паміж падкантрольнымі ім ТБШ і Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры (БІГіК, створаны ў 1926 г. як альтэрнатыўная ТБШ культурна-асветніцкая арганізацыя) было заключана ў лютым 1936 г. Як успамінаў Ф. Стацкевіч, *«ад 1936 г. пачаўся кантакт і супрацоўніцтва тэбэшоўцаў з Беларускім народным Аб’яднаннем у асобах кс. Адама Станкевіча, Дубейкоўскага, Багдановіча, Шутовіча і інш. Пры неафіцыйным супрацоўніцтве з КПЗБ утварыўся Народны Фронт. Праца яго адбывалася галоўным чынам на грунце Школьнага сакратарыяту, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі ТБШ, Беларускага Народнага Аб’яднання і Інстытуту Гаспадаркі і Культуры»* [48, арк. 85].

Аднак вынікі сумеснага выступлення гэтых дзвюх заходнебеларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый у 1936 г. можна прызнаць супярэчлівымі. З аднаго боку, пры рознасці ідэйна-палітычных поглядаў

агульнай была глыбокая занепакоенасць пагрозай паланізацыі беларусаў. Адбылося адраджэнне дзейнасці ТБШ і ажыўленне працы структур БІГіК. З другога боку, не ўдалося прадухіліць канчатковага знікнення беларускіх школ. За *"правядзенне падрыўной дзейнасці"* 2 снежня 1936 г. была забаронена дзейнасць ТБШ, а праз два дні і БІГіК [49, арк. 445; 50, с. 634].

**Заключэнне**

У ходзе праведзенага аналізу архіўных крыніц, матэрыялаў перыядычнага друку ўдалося абгрунтаваць, што ў гісторыі ТБШ перыяд ад зацвярджэння праекта статута да яго зацвярджэння (г. зн. з 26 лютага да 1 ліпеня 1921 г.) з'яўляўся падрыхтоўчым. Дату зацвярджэння статута ТБШ (1 ліпеня 1921 г.) трэба лічыць за пачатковы пункт у дзейнасці гэтай легальнай беларускай культурна-асветніцкай арганізацыі.

У арганізацыйным развіцці ТБШ можна вылучыць тры перыяды: пачатак 1920-х гг. (мела вузкую сацыяльную базу – пераважна інтэлігенцыю, дзейнасць была абмежавана Віленшчынай); 1926–1930 гг. (стала масавай культурна-асветніцкай арганізацыяй: у сярэдзіне 1930 г. налічвала 12 акруговых управаў, больш 500 гурткоў, якія аб'ядналі звыш 15 тыс. чалавек па ўсёй Заходняй Беларусі); 1931–1936 гг. (заняпад таварыства і спроба яго аднаўлення).

Дзякуючы гарманічнаму спалучэнню дзейнасці кіраўніцтва і нізавых структур, ТБШ паслядоўна і мэтанакіравана выступала супраць паланізацыі, сацыяльнага ўціску, павышала агульнаадукацыйны і культурны ўзровень беларускага насельніцтва, яго нацыянальную самасвядомасць.

У цэлым атрыманыя на цяперашні час дасягненні ў вывучэнні гісторыі ТБШ з'яўляюцца падставай для падрыхтоўкі грунтоўнага манаграфічнага выдання па гэтай тэме. Варта таксама сістэматызаваць і ўвесці ў навуковы ўжытак асобнай хрэстаматыяй успаміны, публікацыі, раскіданыя ў розных архівах, часопісах і газетах. Не менш актуальнай застаецца і справа мемарыялізацыі гісторыі ТБШ, яе кіраўнікоў і асабліва мясцовых актывістаў у назвах вуліц, плошчаў, школ, бібліятэк ці іншых установ культуры.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Мятла, П. В. Аб Таварыстве беларускае школы і яго барацьбе / П. В. Мятла. – Мінск : Беларус. АН, 1932. – 36 с.
2. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.
3. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.
4. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков. 1918–1939 гг. / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 335 с.
5. Говін, С. В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / С. В. Говін. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1974. – 95 с.
6. Ладысеў, У. Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938 гг.) / У. Ф. Ладысеў. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 168 с.
7. Сянькевіч, Г. Р. Народная асвета ў Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.) / Г. Р. Сянькевіч // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск : Нар. асвета, 1968. – С. 341–395.
8. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : PWN, 1984. – 287 s.
9. Gomółka, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk : Wydaw. Politechniki Gdańskiej, 1992. – 179 s.
10. Смалярчык, А. Таварыства беларускай школы ў Палескім ваяводстве ў 1926–1933 гг. / А. Смалярчык // Беларус. гіст. агляд. – 2015. – Т. 22, сш. 1–2 (42–43). – С. 153–178.
11. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Мінск : Беларусь. – 1995. – Ч. 2. – С. 214–264.
12. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945) / пад рэд. Г. Р. Сянькевіч [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 495 с.

13. Ладысеў, У. Ф. Цяжкі шлях выпрабаванняў / У. Ф. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 85–86.

14. Вабішчэвіч, А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 2. – С. 38–46.

15. Вабішчэвіч, А. Таварыства беларускай школы (1921 – 1936 гг.) / А. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 1997. – № 1. – С. 86–92.

16. Вабішчэвіч, А. Таварыства беларускай школы: першыя гады існавання / А. Вабішчэвіч // Спадчына. – 1996. – № 5. – С. 31–51.

17. Вабішчэвіч, А. Таварыства беларускай школы / А. Вабішчэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 489–490.

18. Вабішчэвіч, А. Таварыства беларускай школы / А. Вабішчэвіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 15. – С. 372.

19. Вабищевич, А. Товарищество белорусской школы / А. Вабищевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. – Минск, 2008. – Т. 7. – С. 232.

20. Вабішчэвіч, А. Савецкі фактар у грамадскім жыцці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / А. Вабішчэвіч // Знакамітыя мінчане: Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны : матэрыялы X Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 13–14 верас. 2016 г. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2017. – С. 83–97.

21. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2004. – 115 с.

22. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

23. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – С. 403–404, 410–413, 420–422.

24. Загідулін, А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна : ГрДУ, 2010. – 183 с.

25. Горны, А. Рэгіянальныя структуры беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Горны // Беларус. гіст. часоп. – 2021. – № 6. – С. 14–22.

26. Глагоўская, Л. 100 гадоў Таварыства беларускай школы (ТБШ) [Электронны рэсурс] / Л. Глагоўская. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=H5GhT2OXUMs&t=14s. – Дата доступу: 16.08.2022.

27. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 883. Воп. 1. Спр. 14.

28. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). – F. 31. Ap. 1. B. 13.

29. Беларускі звон. – 1921. – № 1 (22 сак.).

30. Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok, 2001. – № 15.

31. Беларускі звон. – 1921. – № 19 (4 ліст.).

32. Беларускі звон. – 1921. – № 8 (19 жн.).

33. Статут Таварыства беларускае школы. – Вільня : Друк, 1921. – 20 с.

34. Беларускія ведамасці. – 1921. – № 4 (3 кастр.).

35. Беларускі звон. – 1921. – № 8 (19 жн.).

36. Беларускія ведамасці. – 1921. – № 2 (19 верас.).

37. Беларускі звон. – 1921. – № 18 (28 кастр.).

38. Беларускі звон. – 1921. – № 19 (4 лістап.).

39. Беларускі звон. – 1922. – № 1 (6 студз.).

40. LCVA. – F. 51. Ap. 17. B. 521.

41. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр.). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 768.

42. Статут Таварыства беларускае школы. – Вільня : Друк. імя Ф. Скарыны, 1926. – 30 с.

43. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 195.

44. ДАБр. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 959.

45. ДАБр. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 939.

46. НАРБ. – Ф. 242-п. Воп. 1. Спр. 301.

47. Towarzystwo Szkoły Białoruskiej na ławie oskarzonych // Pregląd Wileński. – 1933. – № 3. – S. 2–4.

48. БДАМЛіМ. – Ф. 55. Воп. 1. Спр. 322.

49. Archiwum Akt Nowych. – Zespół 9/1. Sygn. 963.

50. Sprawy narodowościowe. – 1936. – № 6.

REFERENCES

1. Miatla, P. V. Ab Tavarystvie bielaruskaje shkoly i jaho barac'bie / P. V. Miatla. – Minsk : Bielarus. AN, 1932. – 36 s.

2. Palujan, U. A. Bielaruskaja sialianska-rabochaja Hramada / U. A. Palujan. – Minsk : Navuka ì tekhnika, 1967. – 224 s.

3. Polujan, V. A. Rievoliucionno-diemokratichieskoje dvizhenije v Zapadnoj Bielorussii (1927–1939 gg.) / V. A. Polujan. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1978. – 359 s.

4. Macko, A. N. Rievoliucionnaja bor'ba trudiashchikhsia Pol'shi i Zapadnoj Bielorussii protiv gniota burzhuazii i pomieshchikov. 1918–1939 gg. / A. N. Macko. – Minsk : Bielarus',1972. – 335 s.

5. Hovin, S. V. Druk Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / S. V. Hovin. – Minsk : Vyd-va BDU, 1974. – 95 s.

6. Ladysieu, U. F. KPZB – arhanizatar barac'by pracounykh za demakratychnyja pravy i svabody (1934–1938 hh.) / U. F. Ladysieu. – Minsk : Vyd-va BDU, 1976. – 168 s.

7. Sian'kievich, H. R. Narodnaja asvieta u Zakhodniaj Bielarusi (1920–1939 hh.) / G. R. Sian'-kievich // Narysy historyi narodnaj asviety i piedahahichnaj dumki u Bielarusi. – Minsk : Nar. asvieta, 1968. – S. 341–395.

8. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : PWN, 1984. – 287 s.

9. Gomółka, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk : Wydaw. Politechniki Gdańskiej, 1992. – 179 s.

10. Smaliarchyk, A. Tavarystva bielaruskaj shkoly u Palieskim vajavodstvie u 1926–1933 hh. / A. Smaliarchyk // Bielarus. hist. ahliad. – 2015. – T. 22, ssh. 1–2 (42–43). – S. 153–178.

11. Narysy historyi Bielarusi : u 2 ch. – Mìnsk : Bielarus', 1995. – Ch. 2. – S. 214–264.

12. Narodnaja adukacyja i piedahahichnaja navuka u Bielarusi (1917–1945) / pad red. H. R. Sian'-kievich [i insh.]. – Minsk : Nar. asvieta, 1993. – 495 s.

13. Ladysieu, U. F. Ciazhki shliakh vyprabavanniau / U. F. Ladysieu // Bielarus. hist. chasop. – 1994. – № 1. – S. 85–86.

14. Vabishchevich, A. Nacyjanal'naja shkola u Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / A. Vabishchevich // Bielarus. hist. chasop. – 1994. – № 2. – S. 38–46.

15. Vabishchevich, A. Tavarystva bielaruskaj shkoly (1921–1936 hh.) / A. Vabishchevich // Bielarus. hist. chasop. – 1997. – № 1. – S. 86–92.

16. Vabishchevich, A. Tavarystva bielaruskaj shkoly: piershyja hady isnavannia / A. Vabishchevich // Spadchyna. – 1996. – № 5. – S. 31–51.

17. Vabishchevich, A. Tavarystva bielaruskaj shkoly / A. Vabishchevich // Encyklapiedyja historyi Bielarusi : u 6 t. – Minsk : BielEn, 2001. – T. 6, kn. 1. – S. 489–490.

18. Vabishchevich, A. Tavarystva bielaruskaj shkoly / A. Vabishchevich // Bielaruskaja encyklapiedyja : u 18 t. – Minsk : BielEn, 2002. – T. 15. – S. 372.

19. Vabishchievich, A. Tovarishchiestvo bielorusskoj shkoly / A. Vabishchievich // Riespublika Bielarus' : enciklopiedija : v 7 t. – Minsk, 2008. – T. 7. – S. 232.

20. Vabishchevich, A. Saviecki faktar u hramadskim zhycci Zakhodniaj Bielarusi u 1921–1939 hh. / A. Vabishchevich // Znakamityja minchanie: Minsk i Minshchyna paslia padziej 1921 hoda – liosy liudziej i krainy : materyjaly X Mizhnar. navuk.-tearet. kanf., Minsk, 13–14 vieras. 2016 h. – Minsk : Vyd. V. Khursik, 2017. – S. 83–97.

21. Vabishchevich, A. M. Asvieta u Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939) / A. M. Vabishchevich. – Brest : BrDU, 2004. – 115 s.

22. Vabishchevich, A. M. Nacyjanal'na-kul'turnaje zhyccio Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / A. M. Vabishchevich. – Brest : BrDU, 2008. – 319 s.

23. Historyja Bielarusi : u 6 t. / redkal.: M. Kasciuk (hal. red.) [i insh.]. – Minsk : Ekapierspiektyva, 2000–2011. – T. 5 : Bielarus' u 1917–1945 hh. / A. Vabishchevich [i insh.]. – 2006. – S. 403–404, 410–413, 420–422.

24. Zahidulin, A. M. Bielaruskaje pytannie u pol'skaj nacyjanal'naj i kanfiesijnaj palitycy u Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / A. M. Zahidulin. – Hrodna : HrDU, 2010. –183 s.

25. Horny, A. Rehijanal'nyja struktury bielaruskaha nacyjanal'naha rukhu u Zakhodniaj Bielarusì (1921–1939 hh.) / A. Horny // Bielarus. hist. chasop. – 2021. – № 6. – S. 14–22.

26. Hlahouskaja, L. 100 hadou Tavarystva bielaruskaj shkoly (TBSh) [Eliektronny resurs] / L. Hlahouskaja. – Rezhym dostupu: https://www.youtube.com/watch?v=H5GhT2OXUMs&t=14s. – Data dostupu: 16.08.2022.

27. Nacyjanal'ny arkhiu Respubliki Bielarus' (NARB). – F. 883. Vop. 1. Spr. 14.

28. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). – F. 31. Ap. 1. B. 13.

29. Bielaruski zvon. – 1921. – № 1 (22 sak.).

30. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 15. – Białystok, 2001.

31. Bielaruski zvon. – 1921. – № 19 (4 list.).

32. Bielaruski zvon. – 1921. – № 8 (19 zhn.).

33. Statut Tavarystva bielaruskaje shkoly. – Vil'nia : Druk, 1921. – 20 s.

34. Bielaruskija viedamasci. – 1921. – № 4 (3 kastr.).

35. Bielaruski zvon. – 1921. – № 8 (19 zhn.).

36. Bielaruskija viedamasci. – 1921. – № 2 (19 vieras.).

37. Bielaruski zvon. – 1921. – № 18 (28 kastr.).

38. Bielaruskì zvon. – 1921. – № 19 (4 list.).

39. Belaruski zvon. – 1922. – № 1 (6 studz.).

40. LCVA. – F. 51. Ap. 17. B. 521.

41. Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci (DABr.). – F. 67. Vop. 1. Spr. 768.

42. Statut Tavarystva bielaruskaje shkoly. – Vil'nia : Druk. imia F. Skaryny, 1926. – 30 s.

43. Bielaruski dziarzhauny arkhiu-muziej litaratury i mastactva (BDAMLiM). – F. 3. Vop.1. Spr. 195.

44. DABr. – F. 67. Vop. 1. Spr. 959.

45. DABr. – F. 67. Vop. 1. Spr. 939.

46. NARB. – F. 242-p. Vop. 1. Spr. 301.

47. Towarzystwo Szkoły Białoruskiej na ławie oskarzonych // Pregląd Wileński. – 1933. – № 3. – S. 2–4.

48. BDAMLiM.– F. 55. Vop. 1. Spr. 322.

49. Archiwum Akt Nowych. – Zespół 9/1. Sygn. 963.

50. Sprawy narodowościowe. – 1936. – № 6.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 07.12.2022*